БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
юрыдычны факультэт
кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

**Т. І. ДОЎНАР**

# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ (У СХЕМАХ)

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
У 2-Х ЧАСТКАХ. ЧАСТКА ДРУГАЯ.
для студэнтаў 1 курса юрыдычнага факультэта

Мінск 2003

Падрыхтаваны доктарам юрыдычных навук, прафесарам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта
Доўнар Таісіяй Іванаўнай

Рэцэнзенты:
Юхо Я.А. – доктар юрыдычных наук, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта;
Слабодчыкаў А.А. – кандыдат юрыдычных навук, прафесар Інстытута сучасных ведаў.

Зацверджаны на пасяджэнні кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (пратакол № 8 ад 17 чэрвеня 2002 г.)

**Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (у схемах)/** Вучэбна-метадычны комплекс у 2-х частках. Частка другая. Мн.: 2003.

Вучэбна-метадычнае выданне падрыхтавана ў адпаведнасці з тыповай вучэбнай праграмай па курсе гісторыі дзяржавы і права Беларусі і мае этай дапамагчы студэнтам у засваенні праграмнага матэрыялу і паспяховым авалоданні прадметам.

Прызначана для студэнтаў вышэйшых юрыдычных навучальных устаноў.

## ПРАДМОВА

Дадзенае выданне ўяўляе сабой другую частку вучэбна-метадычнага комплекса па гісторыі дзяржавы і права Беларусі, прызначанага для студэнтаў юрыдычнага факультэта. Кніга падрыхтавана ў адпаведнасці з тыповай праграмай курса.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі, як гісторыка-прававая дысцыпліна, мае не толькі пазнавальнае, але метадычнае і практычнае значэнне. Яна дапамагае выпрацаваць у студэнтаў погляд на дзяржаву і права як на дынамічны арганізм, які пастаянна развіваецца ў цеснай узаемасувязі з рэальным грамадска-палітычным становішчам. Яна таксама садзейнічае набыццю студэнтамі навыкаў абагульнення канкрэтна-гістарычнага матэрыялу і умення аналізаваць гэты матэрыял і фармуляваць навукова абгрунтаваныя вывады. Параўнальны аналіз гісторыі развіцця заканадаўства неабходны для правільнага разумення і ўсведамлення дзеючых законаў і крытычнай ацэнкі застарэлага нарматыўна-прававога матэрыялу.

У якасці гістарычнай навукі гісторыя дзяржавы і права Беларусі ўяўляе сабой частку гісторыі чалавецтва, а ў якасці юрыдычнай – адну з фундаментальных прававых дысцыплін. Вывучэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі (прычын і заканамернасцей ўзнікнення, станаўлення і развіцця на тэрыторыі нашай краіны дзяржавы і права), дазваляе глыбей асэнсаваць асаблівасці сучаснай дзяржаўнасці і яе прызначэнне. Для таго, каб прагназіраваць далейшае развіццё ўсёй чалавечай супольнасці неабходна вывучыць, прааналізаваць і асэнсаваць прычыны ўзнікнення і паэтапнае развіццё ўсіх без выключэння дзяржаўнасцей, выявіць заканамернасці і тэндэнцыі гістарычнага працэсу, звярнуць увагу на асаблівасці ў развіцці канкрэтных дзяржаў і дзяржаўна-прававых інстытутаў. Усё гэты тычыцца і гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Вучэбна-метадычны дапаможнік мае мэтай дапамагчы студэнтам у вывучэнні вучэбнай дысцыпліны гісторыі дзяржавы і права Беларусі. У першую чаргу ён прызначаны для студэнтаў-юрыстаў, якія з дапамогай змешчаных у ім матэрыялаў (схемаў і табліц) змогуць належным чынам засвоіць прадмет, а ў далейшым паспяхова авалодаць спецыяльнымі юрыдычнымі дысцыплінамі (канстытуцыйным, грамадзянскім, крымінальным, працэсуальным правам і інш.) і стаць дасведчанымі спецыялістамі.

Вывучэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі дапамагае фарміраванню ў студэнтаў прававога мыслення і павышэнню ўзроўню прававой культуры. Вучэбная дысцыпліна прызначана даць студэнтам яснае і глыбокае разуменне заканамернасцей гістарычнага працэсу ўзнікнення і развіцця дзяржаўнасці і права, змены тыпаў і формаў дзяржаўнасці, эвалюцыі дзяржаўных органаў і прававых інстытутаў і г. д. Тым больш, што некаторыя праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі застаюцца яшчэ недастаткова даследаванымі, а шэраг з іх разглядаецца з некалькіх, часам супярэчлівых пунктаў гледжання.

Вывучэнне гісторыі дзяржаўнасці Беларусі непасрэдна ўплывае на фарміраванне светапогляду, дапамагае ўсведамленню і асэнсаванню поспехаў і памылак у гісторычным развіцці сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага

жыцця народа. Вучэбны дапаможнік прызначаны садзейнічаць не толькі паспяховаму авалодванню прадметам, але і фарміраванню ўласнага светапогляду, развіццю самастойнасці студэнтаў, творчай актыўнасці і ініцыятывы, што з’явіцца падставай да якаснай прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў-правазнаўцаў.

Вучэбны дапаможнік мае мэтай даць адказ на пытанні, якія з’яўляюцца найбольш складанымі для студэнтаў, а таксама і найбольш важнымі ў гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Прыведзеныя схемы і табліцы маюць мэтай дапамагчы студэнтам паспяхова авалодаць не толькі праграмным матэрыялам па курсе гісторыі дзяржавы і права Беларусі, але і навыкамі асэнсавання і аб’ектыўнага аналізу гістарычнага развіцця дзяржавы і права.

Яны з’яўляюцца падставай для належнай падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў і экзаменаў, а таксама для напісання кантрольных і курсавых работ.

# 1. ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ (ПРАДМЕТ, ЗАДАЧЫ, АСАБЛІВАСЦІ)

**Прадмет**

Працэс, заканамернасці, тэндэнцыі, асаблівасці ўзнікнення, станаўлення і развіцця дзяржавы і права ў беларускага народа на ўсім працягу яго гісторыі.

**Задачы**

1. Дакладнае і сістэмнае вывучэнне падзей і фактаў, заканадаўства ў іх гістарычным развіцці.
2. Непрадузяты аналіз, правільнае навуковае тлумачэнне іх.
3. Выяўленне заканамернасцей, тэндэнцый і перспектыў развіцця дзяржавы і права.

**Асаблівасці**
**гісторыі дзяржавы і права Беларусі**

- вывучалася часам аднабакова і тэндэнцыйна;
- гістарычныя падзеі і факты трактаваліся суб’ектыўна і адвольна;
- звярталася ўвага больш на негатыўныя моманты ў жыцці народа дакастрычніцкага перыяду;
- некаторыя праблемы і пытанні беларускай гісторыі замоўчваліся або мала вывучаліся (нацыянальна-вызваленчы рух, ваенная гісторыя, прававая гісторыя і інш.);
– гісторыя беларускага народа цесна звязана і пераплецена з гісторыяй суседніх народаў, асабліва літоўскага, польскага, рускага;
– на працягу стагоддзяў змянялася назва беларускага народу, што стварае пэўныя цяжкасці ў вывучанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі

## 1.1. АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ВЫВУЧЭННЯ ПРАДМЕТА

**Гісторыя дзяржавы і права Беларусі вывучае ўзнікненне, станаўленне і развіцце дзяржавы і права ў народа, які насяляў Беларусь са старажытных часоў да сучаснага перыяду, у тым ліку:**

↓

прычыны і перыяд узнікнення і станаўлення дзяржаўнасці;

↓

ход гістарычных падзей у іх храналагічнай паслядоўнасці з выяўленнем пэўных тэндэнцый і заканамернасцей;

↓

працэс станаўлення і развіцця розных палітычных інстытутаў (князь, рада, веча (сойм) і г. д.);

↓

крыніцы права, працэс фарміравання прававых інстытутаў і галін права, асаблівасці ў развіцці заканадаўства;

↓

прававое становішча насельніцтва (класаў, саслоў'яў, розных сацыяльных груп і інш.);

↓

супастаўленне гістарычнага працэсу і этапаў развіцця беларускай дзяржаўнасці з аналагічнымі працэсамі ў іншых дзяржавах і г. д.

## 1.2. СТАРАЖЫТНЫЯ НАЗВЫ БЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА (ПІСЬМОВЫЯ ЗВЕСТКІ)

**“Будзіны” неўры –** першы ўспамін у VI ст. да н.э. жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі (грэчаскі гісторык Герадот).

**“Неўры”-** народ, які жыў ля Дняпра па думках Пампонія мела, Гая Плінія Секунда, Марціна Капелы (1 ст. н.э. – V ст.н.э.).

**“Норыкі”, “нарцы” – “славяне”** (“Аповесць мінулых гадоў”) і іншыя летапісы.

**“Вянеды”, “славяне” –** паўднёвыя славяне ў заходнееўрапейскай літаратуры.

**“Крывічы”, дрэговічы” (другавіты), “радзімічы” “бужане” і інш. –** у летапісах.

**“Скіфы” -** народы ўсей Усходняй Еўропы – назву ўжывалі грэчаскія і візантыйскія вучоныя да Х ст.

**“Літва”, “Русь” –** пачалі ўжывацца замест назвы “Вялікая Скіф” (IX – XII ст.) – заходнееўрапейская і расійская літаратура.

**Палачане, берасцейцы, віцебляны (віцьбічы), меняне і інш. –** летапісы ўласныя і замежныя.

**“Літва” з утварэннем Вялікага княства Літоўскага –** у летапісах, міжнародных пагадненнях і інш.

**Назва “Белая Русь”, “Беларусь”**

**“Белая Русь”, “Беларусь” – паступова ў летапісах з XIVст., паралельна з назвай “Літва”:**
- як назва, процілеглая назве “Чорная Русь”;
- у XII ст. узгадваецца ў Раскольніцкім і Растоўскім манускрыптах;
- называлі Маскоўска – Суздальскую Русь;
- называлі ўкраінскія землі;
- землі Кіева, Мазыра, Мсціслаўля, Віцебска, Оршы, Полацка, Смаленска і зямлі Северскія;
- размешчана паміж Уралам і Азоўскім морам (польскі вучоны Мацей Мяхоўскі) і інш.

**Версіі аб паходжанні назвы “Белая Русь”:**

– вольная ад татара-мангольскага іга;
– хрысціянізаваная Русь;
– ад светлага, белага адзення насельніцтва;
– заходняя Русь і інш.

## 2. ДЗЯРЖАВА І ПРАВА НА БЕЛАРУСІ Ў СТАРАЖЫТНЫ ПЕРЫЯД

**Прычыны і перадумовы ўзнікнення дзяржаўнасці на Беларусі**

| **Эканамічныя** | **Сацыяльныя** | **Палітычныя** |
|---|---|---|
| 1. Выраб і выкарыстанне жалезных прылад працы.<br>2. Адасабленне земляробства ад жывёлагадоўлі.<br>3. Развіцце рамяства і гандлю, узнікненне ўнутранага, а потым знешняга рынку. | 1. З'яўленне ў грамадстве сацыяльнай няроўнасці (людзей багатых і бедных, вольных і рабоў).<br>2. З'яўленне і вылучэнне радавой знаці і афармленне яе ў орган улады. | 1. Узнікненне супярэчнасцей паміж рознымі сацыяльнымі групамі.<br>2. Неабходнасць абароны тэрыторыі і насельніцтва ад знешняга ўмяшання.<br>3. Пашырэнне тэрыторыі э мэтай бяспекі і паляпшэння ўмоў жыцця. |

**Перыяд узнікнення дзяржаўнасці (меркаванні вучоных)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| IX ст. новай эры. Агульнапрынятая дата, асабліва ў савецкай гістарыяграфіі. | Пачатак новай эры (I-Vст.). Шэраг вучоных дакастрычніцкага перыяду (В. Тацішчаў, М. Уладзімірскі-Буданаў), савецкія, сучасныя расійскія і ўкраінскія вучоныя. | V-VI ст. новай эры. Навукоўцы розных дзяржаў сучаснага і мінулага перыядаў. | Да новай эры. Летапісы, гістарычныя дакументы (Герадот, іншыя старажытнагрэчаскія і старажытнарымскія вучоныя). Сучасныя навукоўцы (І. А. Юхо і інш.). |

## 2.1. СТАРАЖЫТНЫЯ ДЗЯРЖАВЫ (КНЯСТВЫ) НА БЕЛАРУСІ

**Полацкая**

**Турава – Пінская**

**Берасцейская**

**Навагрудская**

**Віцебская**

**Менская, Браслаўская, Лукомльскае, Друцкае і інш.**

**Узніклі прыкладна на пачатку новай эры**

**На працягу свайго існавання княствы утваралі саюзы між сабой і з іншымі княствамі, якія потым распадаліся і г. д. Сталі палітыка-эканамічным цэнтрам новай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага.**

## 2.2. ДЗЯРЖАЎНА-ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД СТАРАЖЫТНЫХ ДЗЯРЖАЎ

| **Князь** | **Рада (савет) пры князю** | **Веча (сойм)** |
|---|---|---|
| Пасаднік.<br>Тысяцкі.<br>Падвойскі (войскі). | Цівун.<br>Ключнік.<br>Мечнік.<br>Чашнік<br>і інш. | Вольныя людзі (мужчыны-домаўласнікі) |

## 2.3. АСНОЎНЫЯ РЫСЫ ЗВЫЧАЁВАГА ПРАВА

**Звычаёвае права** – гэта сістэма няпісаных правілаў паводзін людзей, для якой былі характэрны:

- партыкулярызм – у кожнай зямлі (княстве) дзейнічала ўласнае права
- традыцыяналізм і кансерватызм
- дуалізм – ідэя поўнага бяспраўя рабоў і фармальнай роўнасці свабодных людзей пры фактычным існаванні ільгот для феадалаў.

## 2.4. ПЕРЫЯД ДЗЕЙНАСЦІ ЗВЫЧАЁВАГА ПРАВА

Звычаёвае права дзейнічала доўгі час. Статут 1529 г. забараніў яго дзеянне і рабіў выключэнне з гэтага правіла толькі ў выпадку адсутнасці адпаведнай статутнай нормы.
Статут 1566 г. увогуле забараніў карыстанне звычаевым правам, аднак Статут 1588 г. у пэўных выпадках зноў дазволіў карыстанне звычаёвымі нормамі.

## 2.5. ШТО РЭГУЛЯВАЛА ЗВЫЧАЁВАЕ ПРАВА

Усе праваадносіны ў грамадскім жыцці: дзейнасць і сістэму дзяржаўных органаў і іх кампетэнцыю; правы і абавязкі насельніцтва; узаемаадносіны з іншымі дзяржавамі; злачынства і пакаранне; маёмасныя адносіны; сямейна-шлюбныя адносіны і інш.

## 2.6. СТАРАЖЫТНЫЯ КРЫНІЦЫ ПРАВА – ДАГАВОРНЫЯ ГРАМАТЫ

| Год заключэння дагавору | Хто заключаў | Асноўныя палажэнні | Асноўныя галіны права |
|---|---|---|---|
| 1229 | Смаленскае, Полацкае і Віцебскае княствы з Рыгай і Готскім берагам. | Замацаванне прававых нормаў, якія забяспечвалі ўстойлівыя гандлёвыя адносіны паміж купцамі гэтых зямель на падставе ўзаемнасці і роўнасці бакоў. | Грамадзянскае, міжнароднае, адміністрацыйнае, крымінальнае, судова-працэсуальнае. |
| 1263 | Полацкае і Віцебскае княствы з магістрам Лівонскага ордэна Конрадам. | Свабодны гандаль. Мірныя адносіны. Вызначэнне мяжы паміж дзяржавамі. Вызначэнне падсуднасці грамадзянскіх і крымінальных спраў. | Грамадзянскае, крымінальнае, адміністрацыйнае, працэсуальнае. |
| 1265 | Полацкае княства (князь Ізяслаў) з магістрам Лівонскага ордэна і г. Рыгай. | Вызначэнне мяжы пасля вайны Полацкага княства з Лівоніяй. Узнаўленне ранейшых адносін. Забарона пераглядаць ранейшыя судовыя рашэнні. Дагавор заключаны полацкім князем і ад імя віцебскага князя – “Полацк і Віцебск “одно есть”. | Міжнароднае, адміністрацыйнае, грамадзянскае, судова-працэсуальнае. |
| 1309 | Полацкае княства з Рыгай. | Пагадненне аб мірных адносінах, заключанае ад імя полацкага біскупа. | Міжнароднае, грамадзянскае. |
| 1338 | ВКЛ (сумесна з Полацкім і Віцебскім княствамі) з Лівоніяй. | Умовы вольнага гандлю. Больш дакладна вызначалася мяжа паміж дзяржавамі. Пацвярджаліся папярэднія ўмовы вольнага гандлю паміж дзяржавамі. | Міжнароднае, адміністрацыйнае, грамадзянскае, судова-працэсуальнае. |

# 3. УТВАРЭННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД

**КАНЦЭПЦЫІ УТВАРЭННЯ ВКЛ**

Традыцыйная (літоўская)

Старажытная Літва знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Літвы; Літва захапіла беларускія землі (абвергнута многімі вучонымі).

Цэнтрысцкая

Спроба абыйсці ад радыкальнай ацэнкі. Увага на больш працяглы перыяд утварэння ВКЛ, якое спачатку было пашыраным Навагрудскім княствам.

Беларуская (М.Ермаловіч)

“Літва” – старажытная назва беларускіх земляў, якія сталі палітычна-эканамічным цэнтрам ВКЛ. Утварэнне ВКЛ – перш за ўсе вынік аб’яднання беларускіх зямель.

*Перадумовы утварэння ВКЛ*

Эканамічныя

Развіцце вытворчых сіл і гандлева – эканамічных сувязяў паміж старажытнымі княствамі

Міжнародныя

Знешняя агрэсія крыжакоў і татара-манголаў.

Палітычныя

Імкненне ўдзельных княстваў да аб’яднання з мэтай стварэння стабільнай дзяржаўнасці

## 3.1. ВЯЛІКІЯ КНЯЗІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (XIII–XVI СТ.СТ.)

| № п/п | Вялікія князі | Год нараджэння | Год уступлення на трон | Год змяшчэння з трону (або смерці) |
|---|---|---|---|---|
| **1.** | Міндоўг | 1195? | 1219, каранаваўся ў 1253 | 1263 |
| **2.** | Тройнат (Транята) | | 1263 | 1264 |
| **3.** | Войшалк | | 1264 | 1267 |
| **4.** | Шварн Данілавіч | | 1267 | 1270 |
| **5.** | Трайдзен | | 1270 | 1282 |
| **6.** | Пукувер (Літавор) | | 1282 | 1294 |
| **7.** | Віцень | | 1295 | 1316 |
| **8.** | Гедзімін | каля 1275 | 1316 | 1341 |
| **9.** | Яўнуцій | 1325 | 1341 | 1345 |
| **10.** | Альгерд (Андрэй | каля 1296 | 1345 | 1377 |
| **11.** | Ягайла (Якаў, Уладзіслаў) | каля 1348 | 1377 найвышэйшы князь | 1386 (1392) |
| **12.** | Кейстут | 1297 | 1381 | 1382 |
| **13.** | Скіргайла (Іван) | каля 1354 | 1386 | 1392 памёр 1397 |
| **14.** | Вітаўт (Юрый, Аляксандр) | 1350 | 1392 | 1430 |
| **15.** | Свідрыгайла (Леў, Балеслаў) | 1365 (70) | 1430 | 1432, памёр 1452 |
| **16.** | Жыгімонт Кейстуцьевіч | каля 1365 | 1432 | 1440 |
| **17.** | Казімір | 1427 | 1440 | 1492 |
| **18.** | Аляксандр | 1461 | 1492 | 1506 |
| **19.** | Жыгімонт I | 1467 | 1506 | 1548 |
| **20.** | Жыгімонт II Аўгуст | 1520 | 1548 | 1572 |
| **21.** | Стэфан Баторый | 1533 | 1576 | 1586 |

## 3.2. СІСТЭМА ОРГАНАЎ УЛАДЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА






## 3.3. ЦЭНТРАЛЬНЫЯ (ВЫШЭЙШЫЯ) ОРГАНЫ ЎЛАДЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

| Вялікі князь | Рада | Сойм |
| --- | --- | --- |
| – арганізацыя абароны дзяржавы;<br>– падтрыманне парадку у дзяржаве;<br>– арганізацыя дзейнасці дзяржаўнага апарату;<br>– вярхоўны суддзя. | – вышэйшы выканаўча-распарадчы орган, які абмяжоўваў уладу вялікага князя;<br>у склад уваходзілі некалькі дзясяткаў буйных феадалаў (паноў – рады), якія разам з князем кіравалі дзяржавай. | заканадаўчы орган, які фарміраваўся паступова на працягу XV ст.<br>У склад уваходзілі вялікі князь, паны радныя і па два дэпутаты ад кожнага павета. Статут 1588 г. канчаткова зацвердзіў заканадаўчую функцыю сойма. |

## 3.4. ГАЛОЎНЫЯ СЛУЖБОВЫЯ АСОБЫ ДЗЯРЖАВЫ (ПАНЫ РАДНЫЯ)

| | |
| --- | --- |
| Маршалак земскі | Віленскі біскуп |
| Маршалак дворны | Іншыя біскупы |
| Канцлер | Кіраўнікі мясцовасцей (абласныя князі, ваяводы, каштэляны, старасты) |
| Падканцлер | Дворныя і інш. «врядники»: лоўчы вялікі і надворны, канюшы, стольнік, кухмістр, крайчы, чашнік і інш. |
| Падскарбі земскі | |
| Гетман (земскі) найвышшы | |

## 3.5. МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У ВАЯВОДСТВАХ




**Паўнамоцтвы ваяводы:**

– прызначаўся вялікім князем і радай пажыццёва з ліку буйных федалаў, уражэнцаў ВКЛ (некаторыя ваяводы выбіраліся насельніцтвам);
– кіраваў ваяводствам з удзелам іншых службовых асоб і мясцовых соймікаў;
– наглядаў за падтрыманнем феадальнага парадку на тэрыторыі ваяводства, з удзелам мясцовых феадалаў здзяйсняў судовыя функцыі;
– ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва экслуатацыяй усіх крыніц дзяржаўных і вялікакняжацкіх даходаў;
– кіраваў узброеннымі сіламі ваяводства;
– наглядаў за належным правядзеннем работ у дзяржаўным маёнтках, і аб спраўным паступленні падаткаў і даніны з феадальна – залежных людзей.

## 3.6. МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ Ў ПАВЕТАХ

**Стараста**

Прызначаўся вялікім князем і радай пажыццёва з ліку буйных феадалаў. Наглядаў за парадкам у павеце, за маёнткамі і паступленнем дзяржаўных даходаў.

**Харужы** – улік і збор ваеннаабавязанага насельніцтва

**Маршалак** – камандаваў павятовым апалчэннем.

**Падстараста** - намеснік старасты, адміністрацыйна-судовыя функцыі.

**Іншыя службовыя асобы**

- падкаморы
- падсудак
- паляўнічы
- пісар
- войскі
- стольнік
- суддзя
- возны
- лоўчы

**Павятовы соймік – агульны сход шляхты**

## 3.7. ПАВЯТОВЫЯ СОЙМІКІ
## (ІЕРАРХІЯ АСОБ ПА СТАТУТУ 1588. Р. ІІІ, АРТ. 6, 7)



## 3.8. ОРГАНЫ КІРАВАННЯ Ў ГАРАДАХ БЕЛАРУСІ З МАГДЭБУРГСКІМ ПРАВАМ

| | |
|---|---|
| **Войт –** прызначаўся з буйных феадалаў ці гараджан → | Наглядаў за патрыманнем парадку ў горадзе, абаронай горада, за развіццем гарадской гаспадаркі, умацаваннем абаронных пабудоў, зборам падаткаў, ажыццяўляў правасуддзе і інш. |
| **Лейтвойт –** намеснік войта → | Дапамагаў войту ва ўсіх гарадскіх справах, пры неабходнасці замяняў яго. |
| **Радцы** (4 – 20 асоб і інш.) → | Разам з войтам вызначалі агульны накірунак развіцця горада і гарадской гаспадаркі. Наглядалі за падтрыманнем у баявой гатоўнасці абаронных збудаванняў, зборам сродкаў на гарадскія патрэбы. Ажыццяўлялі кантроль за іх расходаваннем. Здзяйснялі правасудде разам з войтам і інш. |
| **Бурмістры** (2, 4 і інш. колькасць) → | Галоўная кампетэнцыя - нагляд за гандлем і справамі, звязанымі з гандлем. Ажыццяўлялі правасуддзе па дробных справах і інш. |
| **Лаўнікі –** засядацелі ў гарадскіх судах (4 – 12) → | Удзельнічалі ў судовых пасяджэннях разам з войтам і радцамі. |

# 4. ГРАМАДСКІ ЛАД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. КЛАССЫ Ў XIV-XVI СТ.

**Феадалы**

- Паны радныя – буйнейшыя феадалы, якія прымалі ўдзел у пасяджэннях Рады ВКЛ
- Паны харугоўныя – буйныя феадалы, якія не прымалі удзел у пасяджэннях Рады, але выходзілі на вайну са сваім войскам
- Сярэднія і дробныя трымалі зямлю пад умовай нясення службы

**Феадальна-залежнае насельніцтва: сяляне і гараджане**

**сяляне:**

*у залежнасці ад гаспадара*

- панскія
- дзяржаўныя
- царкоўныя

*У залежнасці ад стану свабоды*

- "пахожыя" – вольныя людзі
- "непахожыя" запрыгоненыя

*У залежнасці ад абавязкаў і умоў жыцця і інш.*

- цяглыя
- асадныя
- халупнікі і кутнікі
- агароднікі
- баяры
- даннікі – вольныя людзі, плацілі дань прадуктамі сваёй працы; паступова запрыгоньваліся

**гараджане:**

- прыватнаўласніцкія
- дзяржаўныя

## 4.1. ГРАМАДСКІ ЛАД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА У XVI СТ.

**Феадалы**

- буйныя
- сярэднія
- дробныя

**Гараджанне (“месцічы”)**

- Гарадскія “вярхі”
- Сярэднія гараджане
- Гарадскія “нізы”
- Людзі люзныя (лёзныя)

**Сяляне**

- баяры
- даннікі
- цяглыя
- асадныя
- халупнікі
- кутнікі
- агароднікі
- чэлядзь нявольная

## 4.2. КЛАСС ФЕАДАЛАЎ, САСЛОЎ’Е, ШЛЯХТЫ






## 4.3. ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ШЛЯХЕЦКАГА САСЛОЎЯ

**Правы шляхты**

- **палітычныя**
  - удзел у працы павятовых соймікаў
  - удзел у працы сойма (асабіста і праз сваіх прадстаўнікоў)
  - свабодная перамяшчэнне па тэрыторыі дзяржавы і выезд за яе межы
  - выбары суддзяў і удзел у судах
  - права займаць пасады у дзяржаве
- **эканамічныя**
  - недатыкольнасць маёмасці
  - валоданне маёмасцю рухомай і нерухомай
  - распараджэнне нерухомай маёмасцю па Статуту 1529 – 1/3 часткай, а па Статуту 1566 г. – поўнасцю
  - продаж уласнага збожжа за межамі дзяржавы
  - права валодаць сялянамі і судзіць іх
- **асабістыя**
  - недатыкольнасць асобы
  - Непрымяненне некаторых відаў пакаранняў і асаблівыя пакаранні
  - права карыстання гербамі
  - асаблівы парадак абароны «шляхецкага гонару»
  - права шляхецкага гонару

**Абавязкі**

- эканамічныя абавязкі перад дзяржавай, у тым ліку будаўніцтва замкаў, мастоў, дарог і г. д.
- воінскі абавязак уласнымі затратамі – «конно и збройно» – Статут 1566 г.

## 4.4. ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ГАРАДСКОГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ГАРАДАХ З МАГДЭБУРГСКІМ ПРАВАМ



## 4.5. СЯЛЯНСКІЯ ПАВІННАСЦІ

**Адзінкі абкладання у XIII-XV ст.**

- дворышча (некалькі сем’яў, 5-6 дымоў)
- грамада – адна вёска, суседская абшчына
- служба (2-3 дымы)
- дым (сялянская гаспадарка, прыкладна каля 10,6 га markdownрознай зямлі)

**Адзінкі абкладання ў XVI ст.**

- Саха – адзінка абкладання ў залежнасці ад колькасці жывёлы (валоў, каней).
- валока – прыкладна 21,3 га
- дым

**Асноўныя павіннасці**

- асада (чынш)
- даніна (дзякло і інш.)
- паншчына

**Дадатковыя адпрацоўчыя павіннасці**

- талака – калектыўная праца на жніве, касьбе, ворыве і інш.
- гвалты – пільныя, неадкладныя работы, выкліканыя стыхійнымі бедствамі
- падводная павіннасць – перавозка ўсялякіх грузаў на патрэбы дзяржавы
- укол – рамонт дзяржаўных замкаў
- шарваркі – рамонт і будаўніцтва дарог і інш.
- начная варта
- іншыя

# 5. СУДОВАЯ СІСТЭМА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.









## МЯСЦОВЫЯ СУДЫ ДЛЯ ШЛЯХТЫ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Замкавы (гродскі)* – старажытны ўсесаслоўны суд, склад і кампетэнцыя якога паступова змяняліся | *Земскі суд.* Выбарны суд для шляхты, аддзелены ад адміністрацыі. Утвораны ў 1564 г. | *Падкаморскі суд* (выбарны з 1588 г.). Утвораны ў 1564 г. | *Каптуровы суд* на перыяд безкаралеўя. Утвораны ў 1587 г. |
| Вышэйшы склад: мясцовая адміністрацыя (ваяводы, старасты, дзяржаўцы). Ніжэйшы склад: іх намеснікі. Пастаянна-дзеючы суд. | Склад: суддзя, падсудак, пісар. Дзейнічаў пасесійна: па 3-4 тыдні 3 разы на год | Склад: суддзя – падкаморы. Па Статуту 1588 г.: два памочнікі каморнікі | Склад: не менш 5 павятовых суддзяў |
| З утварэннем новых судоў – “спецыялізаваўся” у асноўным на “гарачых справах” і цяжкіх злачынствах (забойствах, разбоях, крадзежах), якія былі расследаваны за 24 гадзіны. | Усе крымінальныя і грамадзянскія справы шляхты за выключэннем спраў, падсудных іншым судам. Выконваў натарыяльныя функцыі. | Справы па зямельных спрэчках шляхты. | Разглядаў судовыя справы ў перыяд безкаралеўя. |

# 6. ЗАКАНАДАЎСТВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

## А) XIV – XV СТАГОДДЗЯЎ

| **Граматы (прывілеі)** | | | |
|---|---|---|---|
| **Агульназемскія** | **Абласныя** | **Валасныя** | **Гарадскія** |
| **Ягайлы 1387 г.** | Полацкай зямлі 1511, 1547г. і інш. | Магілеўскай валасці 1536 г. | Вільні 1387 г. |
| **Гарадзельскія 1413 г.** | Віцебскай зямлі 1503, 1509 г. і інш. | Свіслацкай валасці 1534, 1540 г. | Брэсту 1390 г. |
| **Гродненскія 1432, 1434 г.** | Смаленскай зямлі 1505 г. | Падняпроўскім і іншым валасцям ад 2.10.1511 г. | Гродна 1391 г. |
| **Казіміра 1447 г.** | Жамойскай зямлі 1492 г. | Усвяцкай валасці 1535, 1544 г. | Мінску 1499 г. |
| **Аляксандра 1492 г.** | Драгічынскай зямлі 1547 г. | Чачэрскай валасці 1547, 1554 | Полацку 1498 г. |
| **Іншыя** | іншыя | іншыя | іншыя |

## Б) ПЕРШАЯ СПРОБА КАДЫФІКАЦЫІ ЗАКАНАДАЎСТВА Ў XV СТ.

Судзебнік 1468 г.

## В) КАДЫФІКАЦЫІ XVI СТ.

Статут 1529 г. → Статут 1566 г. → Статут 1588 г.

## 6.1. ПЕРШЫЯ АГУЛЬНАЗЕМСКІЯ ГРАМАТЫ

| ГРАМАТЫ ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ЯГАЙЛЫ | | |
|---|---|---|
| **20.02.1387 г.** | **22.02.1387 г.** | **28.04.1387 г.** |
| Насаджэнне каталіцкай рэлігіі на Беларусі і Літве. | Надзяленне багатымі дарамі і маёнткамі каталіцкага духавенства і касцёлаў, а таксама правамі тых феадалаў, хто прыняў каталіцкую веру. | Замацоўваліся правы князя Скіргайлы на кіраванне Вялікім княствам Літоўскім. |

## 6.2. АГУЛЬНАЗЕМСКІЯ ГРАМАТЫ XV СТАГОДДЗЯ

| **Гарадзельскія 1413 г.** | **Гродзенскія 1432, 1434 г.** | **Вялікага князя Казіміра 1447 г.** | **Вялікага князя Александра1492 г.** |
|---|---|---|---|
| Прымусовае насаджэнне каталіцызму. Абмежаванне ў правах праваслаўных феадалаў. | Ураўнення ў правах праваслаўных з católікамі | Замацаванне суверэнітэту ВКЛ і правоў феадалаў незалежна ад веравызнання (валодаць зямлей з сялянамі, судзіць сялян, наследаваць маёмасць, свабодна выязджаць за межы і г.д.).<br>Адказнасць за злачынства толькі на судзе і па законах дзяржавы і інш. | Вяршэнства рады ў дзяржаўных справах. Абагулены і дапоўнены правы феадалаў (шляхты). Аб Міжнароднай палітыцы ВКЛ (мірнае суіснаванне, прытрымліванне саюзаў, дагавароў і інш.). |

## 6.3. ГАРАДСКІЯ ГРАМАТЫ НА МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА

| Гарады і мястэчкі | Год выдачы граматы | Гарады і мястэчкі | Год выдачы граматы |
|---|---|---|---|
| Бешанковічы | 1634 | Шклоў | 1644 |
| Браслаў | 1500 | Любча | 1590 |
| Брэст | 1390, 1511 | Азёрышча | 1583 (н.п.) |
| Вільня | 1387 | Пінск | 1581 |
| Ваўкавыск | 1503, 1595 | Віцебск | 1597 |
| Высокае | 1494 | Кобрын | 1589 |
| Высокае | 1494, 1510 | Друя | 1618 |
| Горкі | 1619 | Ушачы | 1758 |
| Гродна | 1576, 1496, 1588, 1391 (н.п.), 1496 (п.) | Нясвіж | 1510,1586 |
| Дзісна | 1569 | Чэрыкаў | 1641 |
| Камянец | 1518 | Крычаў | 1633 |
| Мілейчыцы | 1516 | Орша | 1620 |
| Мір | 1579 | Копыль | 1652 |
| Магілёў | 1561, 1577, 1580 | Прывалкі | 1792 |
| Менск | 1499, 1522, 1552, 1571 | Пружаны | 1589 |
| Мозыр | 1577 | Лгішын | 1643 |
| Навагрудак | 1511 | Друя | 1619 |
| Пешчатка | 1569 | Ружыны | 1637 |
| Полацк | 1498, 1510, 1580 | Гарадзец | 1589 |
| Радашковічы | 1569 | Мсціслаў | 1636 |
| Ружаны | 1637 | Мір | 1579 |
| Рэчыца | 1561 | Чавусы | 1634 |
| Слонім | 1531 | Бешанковічы | 1634 |
| Слуцк | 1441 | Ліда | 1587 |
| Сураж | 1576 | Дзівін | 1642 |
| Ула | 1577 | Мальча | 1645 |

## 6.4. АБЛАСНЫЯ ГРАМАТЫ

**Полацкай зямлі: 1511, 1547, 1580, 1634 г.**

**Віцебскай зямлі: 1503, 1509, 1561 г.**

**Смаленскай зямлі: 1505 г.**

**Драгічынскай зямлі: 1511, 1547 г.**

**Жмудскай зямлі 1492, 1574 г. і інш.**

## 6.5. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБЛАСНЫХ ГРАМАТ

**Правы насельніцтва**

- выбіраць ваяводу
- судзіцца ўласнымі судамі і па мясцоваму праву
- мець сваю (некаталіцкую царкву)
- валодаць маёмасцю, карыстацца сервітутамі
- выязджаць за межы дзяржавы

**Абавязкі насельніцтва**

- плаціць падаткі
- падводная і іншая павіннасці
- воінскі абавязак

## 6.6. ВАЛАСНЫЯ ГРАМАТЫ









## 6.7. СТАТУТ 1529 ГОДА
## (13 раздзелаў, каля 300 артыкулаў)

**Права писаные даны панству Великому князьству Литовскому, рускому, жомойтскому и иных через наяснейшого пана Жикгимонта, з божее милости короля Полского, Великого князя Литовского, Русского, Пруского, Жомойтского, Мазовецкого и иных.**

**Роздел вторый.** О обороне земской.
**Роздел третий.** О слободах шляхты и о розмножени Великого Князьства.
**Роздел четвертый.** О поглаве женской и о выправу девок.
**Роздел пятый.** О опекунех.
**Роздел шостый.** О Судьях.
**Роздел семый.** О кгвалтех земских и о боех, и о головщанах шляхетских.
**Роздел осмый.** О праве земельныя, о границах и о межах, о копах.
**Роздел девятый.** О ловы, о пущи, о бортное дерево, о озеро, о бобровые гоны, о хмелища, о сокольи гнезда.
**Роздел десятый.** О именях, которые о в долзех, и о застави.
**Роздел первыйнадцат.** О головщины людей путных и мужицкие и паробоцкие.
**Роздел вторыйнадцат.** О грабежи и о навязки.
**Роздел третiйнадцат.**
**Остаточный.** О злодействе.

## 6.8. СТАТУТ 1566 ГОДА
## (14 раздзелаў, 367 артыкулаў)

**Родзел первый.** О персоне господарской.
**Роздел второй.** О обороне земской.
**Роздел третий.** О вольностяхъ шляхецкихъ и о розмноженью Великого княства Литовского.
**Роздел четвертый.** О судьяхъ и о судехъ.
**Разделъ пятый.** О оправе посагу.
**Родзелъ шостый.** О опекахъ
**Розделъ семый.** О записехъ и продажахъ.
**Розделъ осмый.** О тестаментехъ.
**Розделъ девятый.** О правахъ земскихъ.
**Розделъ десятый.** О ловы о пущу и о дерево бортное.
**Розделъ одинадцатый.** О кгвалтехъ и о головщызнахъ шляхецкихъ.
**Розделъ вторыйнадцать.** О головщызнахъ и навезкахъ людей посполитыхъ.
**Розделъ третiйнадъцать.** О грабежохъ и навезкахъ.
**Розделъ четвертыйнадъцать.** О злодействе всякого стану.

## 6.9. СТАТУТ 1588 ГОДА
## (14 раздзелаў, 488 артыкулаў)

**Розделъ первый.** О персоне нашой господарской
**Роздел второй.** О обороне земской.
**Роздел третий.** О вольностяхъ шляхецкихъ и о розмноженью Великого князства Литовского.
**Роздел четвертый.** О судьяхъ и о судехъ.
**Розделъ пятый.** О оправе посагу и о вене.
**Родзелъ шостый.** О опекахъ.
**Розделъ семый.** О записехъ и продажахъ.
**Розделъ осмый.** О тестаментехъ.
**Розделъ девятый.** О подкоморых в поветех и о правах земленых, о границах и о межах.
**Розделъ десятый.** О пущу, о ловы, о дерево бортное, о озера и сеножати.
**Розделъ одинадцатый.** О кгвалтехъ, о боех и о головщызнахъ шляхецкихъ.
**Розделъ дванадцатый.** О головщызнахъ и навезкахъ людей посполитыхъ и о таких людех и челяди, которая от панов своих отходитъ, также и о слугах прыказных.
**Розделъ третiйнадъцать.** О грабежохъ и навезкахъ.
**Розделъ четвертыйнадъцать.** О злодействе всякого стану.

## 7. УНІІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА З ПОЛЬШЧАЙ

**Крэўская ўнія 1385 г.** →

Унія спрыяла перапыненню працэсу анямечвання Польшчы, садзейнічала акаталічванню насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, узмацненню феадальнага прыгнету, дазваляла аб’яднаць сілы супраць нямецкай і татара-мангольскай. агрэсіі. Унія стала падставай для культурных і гандлёвых сувязяў народаў Еўропы і актывізацыі вытворчых сіл.

**Гарадзельская ўнія 1413 г.** →

Юрыдычна замацавана ў 3-х граматах: 1-я грамата выдадзена ад імя 47 польскіх феадалаў, якія надзялялі 47 феадалаў Вялікага княства Літоўскага сваімі гярбамі і тым самым прымалі іх у гербавыя брацтвы.
У 2-ой грамаце 47 феадалаў ВКЛ прымалі гярбы і абяцалі быць з палякамі ў дружбе і саюзе, а у выпадку смерці вялікага князя Вітаўта абяцалі не выбіраць князя без іх згоды. У сваю чаргу палякі ў выпадку смерці Ягайлы таксама не павінны былі выбіраць новага караля без згоды літвінаў і інш.
